УДК 94(476)

*І. І. Караткевіч*

# ЭТНАГРАФІЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ Ў КАНТЭКСЦЕ НЕПЕРАРЫЎНАСЦІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ ТРАДЫЦЫІ

**Анатацыя.** Гісторыка-этнаграфічныя даследаванні змяшчаюць інфармацыю адносна побыту, сацыяльнай, канфесійнай і этнічнай прыналежнасці, характарыстыкі паводле прафесій або занятку, рамесніцтва, народнай культуры, фальклору насельніцтва пэўнай тэрыторыі. Гэта спрыяе вывучэнню гістарычнай і культурнай спадчыны краю і сведчыць пра даўнасць культурнай і прамысловай традыцыі народа.
**Ключавыя словы**: этнаграфія, Імператарскае рускае геаграфічнае таварыства, Магілёўская губерня.

Гісторыка-этнаграфічныя апісанні і даследаванні змяшчаюць разнастайную інфармацыю адносна побыту насельніцтва пэўнай тэрыторыі, яго канфесійнай, сацыяльнай і этнічнай прыналежнасці, характарыстыкі паводле прафесій або занятку, рамесніцтва, народнага мастацтва, фальклору і да т. п., якія распаўсюджаны на працягу стагоддзяў і з’яўляюцца традыцыйнымі для гэтай мясцовасці.

Часта такія матэрыялы суправаджаюцца выявамі, гравюрамі або чарцяжамі, што павышае навуковую каштоўнасць выдання і цікавасць непрафесійных чытачоў да этнічнай і этнаграфічнай характарыстыкі народа або тэрыторыі. Усё гэта спрыяе станаўленню этнацэнтрычнага погляду жыхароў на развіццё свайго краю, цікавасці да яго гісторыі, побыту і ўспрымання вачыма насельнікаў памежных тэрыторый.

Аднак неабходна ўлічваць, што этнічнасць як прадмет цікавасці і вывучэння не з’яўляецца нязменнай праявай: «в разные исторические эпохи, у разных народов и в разных регионах этничность имела различные формы проявления, испытывала на себе воздействие изоляционистских, интеграционных и иных тенденций» [3, с. 110]. Уплыў такіх тэндэнцый можна лічыць адным з этнакансалідуючых фактараў, разам з такімі ўмовамі станаўлення этнасу, як псіхалагічным і культурным адзінствам, гэта значыць устойлівымі сувязямі і адносінамі людзей унутры сацыяльнай групы, што складаюць нацыянальную самасвядомасць народа. Адсюль вынікае неабходнасць указання на агульны (або нават агульнаеўрапейскі) сацыяльна-гістарычны кантэкст, у межах якога праводзіліся даследаванні этнаграфічнага ўзроўню.

Другая палова XIX – пачатак XX ст. у Еўропе храналагічна яшчэ адносяцца да Асветніцтва, але ў гэты час І. Гердэр і В. фон Гумбальт ствараюць свае вядомыя рамантычныя канцэпцыі, у якіх абодва філосафы вылучаюць тэзіс пра «дух» асобных народаў. Сярод гуманітарных даследаванняў таго часу сфера мовы і маўлення аказалася вылучанай на прыярытэтныя пазіцыі.

В. фон Гумбальт выказаў ідэю пра тое, што мова – гэта не проста сістэма знакаў для звычайнага абмену інфармацыяй. Усе мовы маюць нацыянальную адметнасць і адрозніваюцца адна ад адной, таму варта вывучаць спецыфіку нацыянальных характараў, якая знаходзіць выражэнне ў гісторыі і выніках духоўнага жыцця [4, с. 59].

Цікавасць да жывога народнага жыцця, да самапазнання, да свайго культурнага і гістарычнага мінулага абудзілася ў перыяд канца XVIII – пачатку XIX ст. Што тычыцца славянскіх народаў, то гэтая цікавасць была выклікана барацьбой за існаванне, захаванне сваіх моў і сваёй адметнасці. У гэты час амаль усе славянскія народы знаходзіліся пад чужой уладай – асманскай або аўстрыйскай. Менавіта ва ўмовах барацьбы за незалежнасць і пачалася хваля так званага славянскага рамантызму – славянскае нацыянальнае адраджэнне і славянскі рамантызм у літаратуры.

Адносна ўсходнеславянскіх тэрыторый гэтая хваля асабліва праявілася ў 1840-х гг. і ў канцы 1860-х гг. пры падрыхтоўцы да І славянскага з’езда ў Расіі. Тады аднавілася ідэя агульнай славянскай мовы, пад якой разумелася не толькі старое кніжнае маўленне, але ўсё тое агульнае, уласцівае жывым славянскім мовам, што ўвасабляе сабой славянскую культурную адметнасць.

Славістычныя ідэі і навуковыя сувязі паспрыялі вывучэнню побыту і этнаграфіі славянскіх народаў. У першай палове XIX ст. абвостранае нацыянальнае пачуццё на паўднёваславянскіх тэрыторыях выклікала павышэнне грамадскай цікавасці да фальклору, прычым да ўсёй славянскай вуснай народнай творчасці. Фальклор стаў успрымацца як сярэднявечная традыцыя, спалучаная з містычнай рамантызацыяй духоўнай спадчыны. Дзеячы тагачаснага мастацтва часта звярталіся да фальклорных здабыткаў, навукоўцы разгарнулі шырокамаштабныя этнаграфічныя даследаванні.

Вопыт навуковага апісання праяў нацыянальнай культуры, звязаны спачатку «вначале с идеями романтизма и углубленный вместе с развитием этнографии, диалектологии и фольклора и других смежных наук» [5, с. 10], абумовіў этнаграфічны змест шэрага даследаванняў, якія адлюстроўвалі факты матэрыяльнага побыту і духоўнай культуры свайго народа.

Аднак варта ўлічваць і адрозненні ў гэтых даследаваннях, абумоўленыя «философией и стилем эпохи, в которой происходил процесс создания нации, спецификой социальной структуры общества этой нации, своеобразием системы образования на разных этапах исторического развития» [1, с. 26], інакш кажучы, спецыфікай гісторыка-культурнага працэсу ў краіне.

Этнічны дыскурс адносна Беларусі фарміраваўся пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, калі беларускія землі, разам з польскімі і ўкраінскімі, апынуліся ў складзе Расійскай імперыі і беларускія тэрыторыі аўтаматычна падпалі пад вывучэнне славянства расійскімі навуковымі і грамадскімі коламі.

У 1845 г. у Пецярбургу было створана Імператарскае рускае геаграфічнае таварыства (Императорское русское географическое общество), адным са

структурных падраздзяленняў якога стала аддзяленне этнаграфіі. Падчас экспедыцый аддзялення этнаграфіі адбываўся шырокі збор фактычнага этнаграфічнага матэрыялу.

Вялікае значэнне надавалася даследаванню моў народаў, якія насялялі Расійскую імперыю. Менавіта Імператарскае рускае геаграфічнае таварыства сабрала ўзоры народнай слоўнай спадчыны (прыказкі, прымаўкі, эпас, легенды, песні і да т. п.) і лексікі разнастайных рамёстваў. Адбывалася маштабнае назапашванне этнаграфічнай інфармацыі ў межах усёй дзяржавы.

На беларускіх тэрыторыях работа экспедыцыі Геаграфічнага таварыства праходзіла ў 1860-х гг. і мела на мэце апісаць «племенные и бытовые различия народностей западного края, их численные отношения, распределение по вероисповеданиям и степеням культуры, наконец, хозяйственный быт и степень материального благосостояния» [6, с. 213]. Вынікі экспедыцый публікаваліся ў зборніках-паказчыках літаратуры этнаграфічнага характару, у якой апісваліся адметнасці жылля, адзення, мастацтва, гаспадарчага ладу і рамесніцтва народаў, што насялялі імперыю, згодна з іх месцажыхарствам.

У прыватнасці, адносна апісанняў Магілёўскай губерні, у склад якой уваходзіла 12 уездаў (Быхаўскі, Гомельскі, Горацкі, Клімавіцкі, Магілёўскі, Мсціслаўскі, Аршанскі, Рагачоўскі, Сенненскі, Чавускі, Чэрыкаўскі), у «Библиографический указатель русской этнографической литературы о внешнем быте народов России. 1700–1910 гг.» увайшлі:

– адміністратыўная Карта Магілёўскай губерні з абазначэннем насельніцтва паводле веравызнання (асобна прадстаўлены праваслаўныя, каталікі, стараверы, яўрэі);

– паказчык да неафіцыйнай часткі «Магілёўскіх губернскіх навін» з 1839 г. па 1898 г. Е. Р. Раманава;

– «Опытъ описанія въ географическомъ, историческомъ, этнографическомъ, бытовомъ промышленномъ и статистическомъ отношеніяхъ. Могилевъ. 1907» К. Т. Анікіевіча (прадстаўлены занятак, адзенне, жыллё, музыка, земляробства і промыслы цыганоў, вялікарусаў, яўрэяў, беларусаў);

– «Опытъ описанія Могилевской губерніи въ историческомъ, физико-географическомъ, этнографическомъ, промышленномъ, сельскохозяйственномъ, лесномъ, учебномъ, медицинскомъ и статистическомъ отношеніяхъ, съ двумя картами губерніи и 17 резанными на дереве гравюрами видовъ и типовъ. – Могилевъ на Днепре. 1882 и 1884» А. С. Дэмбавецкага. У трох кнігах апісаны жыллё, адзенне, хатняе і рамесніцкае начынне, промыслы, харчаванне беларусаў, вялікарусаў-старавераў, цыганоў, яўрэяў; жыллё адзенне і занятак шляхты, сялянства, мяшчан [2, с. 37–38].

Асобна сабраны публікацыі пра занятак насельніцтва Магілёўскай губерні: земляробства, жывёлагадоўля, садаводства і пчалаводства, паляванне, лясныя, саматужныя, адыходныя промыслы [2, с. 478–479]. Да таго ж у Бібліяграфічным паказчыку ўлічваліся і даследаванні народнай культуры – народных

песень, звычаяў і пад. Паколькі гэтыя віды побыту і занятку насельніцтва мелі працяглую традыцыю існавання на тэрыторыі, то паводле гэтых звестак можна скласці поўную карціну эканамічнага становішча і культурнага развіцця губерні не толькі на той гістарычны перыяд, але і на некалькі стагоддзяў раней, што сведчыць пра даўнасць і неперарыўнасць культурнай і рамесніцкай традыцыі народа.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Германова, Н. Н.** Кодификация языковых норм: национально-культурные особенности (постановка проблемы) / Н. Н. Германова // Ежегодные междунар. чтения памяти кн. Н. С. Трубецкого – 2000 (17–18 апреля 2000 г.) / Под ред. В. Н. Базылева и В. П. Нерознака. – Москва, 2000. – С. 25–26.

2. Библиографический указатель русской этнографической литературы о внешнем быте народов России. 1700–1910 гг. Жилище. Одежда. Музыка. Искусство. Хозяйственный быт / Сост. Д. К. Зеленин. – Санкт-Петербург: Тип. А. В. Орлова, 1913. – XL, 733 с.

3. **Мыльников, А. С.** Картина славянского мира: взгляд из Восточной Европы: представления об этнической номинации и этничности XVI – начала XVIII в. / А. С. Мыльников. – Санкт-Петербург : Петербургское востоковедение, 1999. – 400 с.

4. **Перлов, А. М.** История науки: введение в методологию гуманитарного знания / А. М. Перлов. – Москва: РГГУ, 2007. – 308 с.

5. **Плотникова, А. А.** Словари и народная культура: Очерки славянской лексикографии / А. А. Плотникова. – Москва: Ин-т славяноведения РАН, 2000. – 208 с.

6. **Пыпин, А. Н.** История русской этнографии. Т. 4. Белоруссия и Сибирь / А. Н. Пыпин. – Минск: БелЭн, 2005. – 256 с.

УДК 903:902.64 (476) «632»

***А. У. Коласаў***

## МЕЗАЛІТ БЕЛАРУСІ Ў ЛЮСТЭРКЕ СТАДЫЯЛЬНАГА ПАДЫХОДУ

**Анатацыя.** Разгледжана характарыстыка стадыяльнага падыходу, які панаваў у археалагічнай навуцы Беларусі ў 1930–40-я гг. і дэманстраваў пераемнасць і непарыўнасць гістарычнага працэса ў развіцці культуры. Для мезаліту (эпіпалеаліту) краіны была прапанавана схема, якая ўлічвала тры культурныя стадыі – свідэрскую (азіль), тардэнуаз і кампіні. У пачатку 1950-х гг. на фоне крытыцы стадыялізму адбыўся пераход да новага падыходу, які патрабаваў улічваць культурную своеасаблівасць мезалітычнай эпохі. Рэцэдывы стадыяльнага схематызму, некаторыя яго канцэптуальныя ўстаноўкі прасочваліся ў даследаваннях 1960–90-х гг.

**Ключавыя словы**: мезаліт, эпіпалеаліт, Беларусь, стадыяльны падыход.

У беларускай археалогіі 20–30-я гг. мінулага стагоддзя сталі этапам мэтанакіраванага пошуку і вывучэння першабытных помнікаў. Экспедыцыі пад кіраўніцтвам К. М. Палікарповіча, А. М. Ляўданскага, А. Д. Кавалені, С. А. Ду-